нимать людей или каучсерфер слишком занят, чтобы приглашать путешественников, можно ограничиться встречей с иностранным гостем в кафе. Профиль настраивается в соответствии с пожеланиями каучсерфера, позволяет отклонять входящие запросы. Каучсерфер может получить максимальную информацию о гостях, которых он собирается принимать.

Цель каучсерфинга – активизировать межкультурный обмен и общение людей в дружеской неформальной обстановке. Это дает возможность реализовать естественное желание узнавать что-то новое, обмениваться опытом в различных сферах жизни. Каучсерфинг – это совершенно новый вид путешествий и отличный способ насладиться красотой жизни и ее значимостью. Для Беларуси как страны развивающейся в направлении туризма каучсерфинг будет способствовать продвижению национального туристического продукта за рубежом и развитию межкультурного общения.

*Г. С. Пяткевіч*

Навуковы кіраўнік – дацэнт Н. В. Савіна

БДЭУ (Мінск)

## ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ ЭКСКУРСІЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Развіццё экскурсійнай дзейнасці на сучасным этапе патрабуе шматвектарнага падыходу да распрацоўкі, арганізацыі і правядзення экскурсій. На дадзены момант у Беларусі прапануюцца і карыстаюцца попытам сотні экскурсійных маршрутраў. Найбольш папулярнымі, як паказваюць даследаванні, з'яўляюцца экскурсіі гісторыка-краязнаўчай, археалагічнай і архітэктурна-горадабудаўнічай тэматыкі [3, с. 30].

Перспектыўным напрамкам экскурсійнай дзейнасці могуць і павінны быць экскурсіі этнаграфічнага накірунку.

У сучасных эканамічных, геапалітычных і культурных умовах экскурсіі дадзенай тэматыкі маюць шматлікія і відавочныя перавагі:

1. Тэрыторыя Беларусі на працягу стагоддзяў знаходзілася ў зоне сутыкнення геапалітычных інтарэсаў суседніх краінаў. З-за няспынных войнаў вялікая колькасць помнікаў архітэктуры і мастацкіх каштоўнасцяў была страчана, а для большасці наяўных характэрна нізкая ступень захаванасці. Таму ажыццяўляць рэкламную кампанію беларускага турыстычнага прадукту пераважна на здабытках архітэктуры ўяўляецца не зусім мэтазгодным [3, с. 48].

Згодна з даследваннямі, варта зрабіць акцэнт на абрадах, традыцыях і фальклоры [4, с. 50; 5, с. 108]. Гэта дазволіць адчуць сапраўдны дух



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by

нацыі, падкрэсліць самабытнасць і ўнікальнасць беларускага народу і, як вынік, павысіць турыстычную прыцягальнасць Беларусі ў вачах замежных турыстаў.

2. Беларусь знаходзіцца ў зоне ўмеранага клімату з моцным уплывам атлантычнх цыклонаў, што абумоўлівае непрацяглы летні камфортны сезон і даволі частыя адлігі ўзімку. Фактар сезоннасці ў большасці выпадкаў, асабліва гэта датычыцца санаторна-курортнага адпачынку, адыгрывае ключавую ролю.

Экскурсіі ж этнаграфічнай тэматыкі не адчуваюць уплыву фактара сезоннасці і могуць быць прапанаваны без абмежаванняў круглы год.

3. Развіццё этнаграфічнага турызму не патрабуе шматмільярдных інвестыцый, складаных бізнес-планаў, пошуку інвестараў і гарантуе атрыманне прыбытку ў кароткатэрміновым перыядзе і самаакупаемасць прадпрыемстваў турыстычнай індустрыі [2, с. 130].

4. Развіццё экскурсійнай дзейнасці ў этнаграфічным накірунку дазволіць забяспечыць дадатковыя працоўныя месцы, асабліва ў малых гарадах і сельскай мясцовасці. Прынясе прыбытак для фальклорных калектываў, мясцовых майстроў, рамеснікаў і г. д.

Такім чынам, выкарыстанне здабыткаў народнай культуры ў экскурсійнай справе з'яўляецца перспектыўным і гарантавана прыбытковым [3, с. 201].

Аднак пры распрацоўцы этнаграфічных экскурсій трэба ўлічваць тое, што аб'екты паказу, звычайна, адрозніваюцца невялікай выразнасцю. Гэтую праблему можна лёгка ператварыць ў яшчэ адну перавагу, дзякуючы выкарыстанню разнастайных сродкаў анімацыі [1, с. 168; 4, с. 130]. Гэта дазволіць стварыць сапраўды якасны канкурэнтназдольны турыстычны прадукт як для ўнутранага спажыўца, так і для замежных турыстаў.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Приезжева, Е. М.* Анимационный менеджмент: учебник / Е. М. Приезжева. – М.: Профиздат, 2007. – 243 с.

2. *Барчуко, И. С.* Экскурсионная деятельность в индустрии гостеприимства: учебное пособие: для учреждений высшего профессионального образования по специальности 100103 «Социально-культурный сервис и туризм» / И. С. Барчуко. – М.: Инфра-М, 2012. – 202 с.

3. *Савина, Н. В.* Экскурсоведение: учеб. пособие для студентов высш. учеб. заведений по специализации «Экономика и управление туризмом» / Н. В. Савина. – Минск: БГЭУ, 2009. – 255 с.

4. *Новак, В. С.* Сцэнізацыя фальклорных свят і абрадаў / В. С. Новак. – Мазыр: Белы вецер, 1999. – 169 с.

5. *Цітоў, В. С.* Этнаграфічная спадчына: Беларусь. Традыцыйна-побытавая культура / В. С. Цітоў. – Мінск: Беларусь, 2001. – 205 с.



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by